ЦЭНТР ЕЎРАПЕЙСКАЙ ТРАНСФАРМАЦЫІ

ЛЯТУЧЫ ЎНІВЕРСІТЭТ




# «Забарона на прафесію» ў Беларусі: вяртанне да савецкіх практык і ўнікальныя рысы

Справаздача па выніках даследавання

© **Цэнтр еўрапейскай трансфармацыі**, 2023

© **Лятучы ўніверсітэт**, 2023

# Змест

Уводзіны: вобласць вызначэння паняцця і гісторыя з'явы ........ 3
Забарона на прафесію ў Беларусі: новы этап ........ 8
1. Формы і метады рэалізацыі забароны на прафесію ........ 9
2. Працэс разгортвання новых практык забароны на прафесію ў 2020-2022 гадах ........ 12
3. Маштабы рэалізацыі забароны на прафесію ў 2020-2022 гадах ........ 16
4. Устаноўкі на рэсаветызацыю ў рэалізацыі забароны на прафесію ........ 21
5. Фактары, што перашкаджаюць паўнаце аднаўлення савецкіх практык і татальнага кантролю ........ 23
6. Сістэмныя эфекты рэалізацыі забароны на прафесію для беларускага грамадства ........ 26
Асноўныя высновы і напрамкі дзеянняў ........ 28

# Уводзіны: вобласць вызначэння паняцця і гісторыя з’явы

Калі гаворка ідзе пра забарону на прафесію (ад ням. *Berufsverbot*, дзе *Beruf* — прафесія, *Verbot* — забарона), трэба адрозніваць два асноўныя кантэксты, у якіх ужываецца гэтае паняцце.

Забаронай на прафесію часта называюць абмежаванне на заняцце пэўнай пасады або ажыццяўленне прафесійнай дзейнасці, якое з’яўляюцца часткай пакарання за здзейсненае злачынства (як правіла, крымінальнае)[*]. Такога кшталту абмежаванні прысутнічаюць у заканадаўствах шмат якіх краін, ёсць падобная норма і ў беларускім крымінальным праве. Часцей за ўсё гэта датычыцца дакладна вызначаных пасад або прафесійных сфер, дзе чалавек пазбаўляецца права на работу, звязана з характарам здзейсненага злачынства, і не з’яўляюцца пажыццёвым, тэрміны дзеяння адпаведнага абмежавання замацаваныя ў заканадаўстве або вызначаюцца рашэннем суда. У любым выпадку, працэдура накладвання такога абмежавання дакладна рэгламентавана на заканадаўчым узроўні.

Зусім іншы кантэкст ужывання тэрміна «забарона на прафесію» ўзнікае, калі мы гаворым пра абмежаванні або перашкаджэнні ў ажыццяўленні прафесійнай дзейнасці, не звязаныя ні з пакараннем за здзейсненыя службовыя або іншыя злачынствы, ні з прафпрыдатнасцю, ні з эканамічнымі фактарамі і станам рынку працы. У гэтым выпадку забарона на прафесію абмяркоўваецца як форма дыскрымінацыі ці пераследу па розных падставах: гендэрных, расавых, нацыянальных, моўных, палітычных, ідэалагічных і да т.п.

У межах гэтага даследавання мы будзем казаць аб забароне на прафесію як аб сацыяльна-палітычнай практыцы, што ўключае разнастайныя перашкаджэнні ў ажыццяўленні прафесійнай дзейнасці, якая з’яўляецца разнавіднасцю **пераследаў менавіта па палітычных і ідэалагічных матывах**.

Упершыню практыка забароны на прафесію па ідэалагічных падставах патрапіла ў фокус грамадскай увагі і абмеркавання ў 1972 годзе. Нагодай для гэтага стала прыняцце ў Заходняй Германіі «Закона аб экстрэмізме», мэтай якога была барацьба з ростам левардыкальных настрояў. У адпаведнасці з гэтым законам грамадзяне, якія нелаяльна адносяцца да існуючага канстытуцыйнага ладу, пазбаўляліся права знаходзіцца на дзяржаўнай службе. У выніку яго прымянення пазбавіліся працы каля 11 тыс. чалавек і,

[*] Напрыклад, «Сучасны эканамічны слоўнік» вызначае забарону на прафесію як «пазбаўленне грамадзян права на пэўныя віды працы, пэўныя пасады ў сувязі з здзейсненымі імі злачынствамі або прафесійнай непрыдатнасцю» (гл.: *Райзберг Б.А., Лозовский Л.Ш., Стародубцева Е.Б.* **Современный экономический словарь**. — 5-е изд., перераб. и доп. — М.: ИНФРА-М, 2007. — 495 с. — (Б-ка словарей «ИНФРА-М»)).

паводле некаторых ацэнак, больш за мільён прайшло праз працэдуру праверкі на лаяльнасць спецыяльнымі камісіямі. Аднак адразу ж пасля прыняцця гэты закон атрымаў негатыўныя ацэнкі з боку праваабаронцаў і грамадзянскай супольнасці Заходняй Германіі, была разгорнута шырокая грамадска-палітычная кампанія, у тым ліку і на міжнародным узроўні, па спыненні яго дзеяння. Дзякуючы гэтым намаганням, да канца 1970-х гадоў звальненне людзей па ідэалагічных матывах практычна спынілася. У большасці земляў Заходняй Германіі дзеянне «Закона аб экстрэмізме» было адменена, а ў землях, дзе ён захаваўся, яго прымяненне кожны раз звязанае з вялікімі скандаламі і грамадскімі пратэстамі.

Яшчэ адзін блізкі, хоць і не ідэнтычны кантэкст, у якім актыўна абмяркоўвалася праблематыка забароны на прафесію на пачатку 90-х гадоў XX стагоддзя — працэсы люстрацыі ў краінах былога «сацыялістычнага лагера» і распаўшагася Савецкага Саюза. У большасці посткамуністычных краін, дзе прымаліся законы аб люстрацыі ці дэкамунізацыі, забарона на прафесію выступала адным з часта практыкуемых інструментаў. Абмежаванні, якія ўводзіліся ў працэсе люстрацыі, у розных краінах адрозніваліся ў частцы прымянення (дзесьці яны датычыліся толькі дзяржаўнай службы і толькі кіруючых пасад, дзесьці распаўсюджваліся на больш шырокі спектр абласцей і прафесій: навуку і адукацыю, СМІ і да т.п.), працэдурным афармленні, сістэматычнасці і жорсткасці правапрымяняльнай практыкі. Аднак фактычна ва ўсіх выпадках забарона на прафесію прымянялася ў дачыненні да асоб, якія займалі кіруючыя пасады пры камуністычных рэжымах, а таксама супрацоўнікаў рэпрэсіўных органаў ды тых людзей, хто тым ці іншым чынам супрацоўнічаў з адпаведнымі спецслужбамі. Пры гэтым факты супрацоўніцтва павінны былі быць даказаныя, усё гэта магло быць аспрэчана ў судзе, як і самі накладаныя абмежаванні на прафесійную дзейнасць**.

І ў першай, і ў другой гістарычных сітуацыях мы маем справу з заканадаўча афармленымі абмежаваннямі на ажыццяўленне прафесійнай дзейнасці, так ці інакш маючымі палітычныя і ідэалагічныя падставы. Аднак часта забарона на прафесію выкарыстоўвалася і працягвае выкарыстоўвацца як механізм пераследу палітычных апанентаў ці проста іншадумцаў без усялякага заканадаўчага афармлення, працэдур і, адпаведна, магчымасцей адстойваць парушаныя законныя правы.

Так, механізмы забароны на прафесію актыўна прымяняліся ў СССР, хаця ўлады не апелявалі да спецыяльнага закона (наадварот, і на заканадаўчым, і на рытарычным узроўнях роўнасць у «праве на працу» была адным з «дасягненняў», якім ганарыліся

** Такога кшталту пазовы падаваліся ў розныя судовыя інстанцыі, ажно да ЕСПЧ; вядомы выпадкі рашэнняў ЕСПЧ, які прызнаваў забарону на прафесію ў дачыненні да некаторых асоб непрапарцыянальнай мерай у сілу розных абставін (тэрмінаў даўнасці, нязначнасцю фактаў супрацоўніцтва з сакрэтнымі службамі), не аспрэчваючы пры гэтым прынцыповую справядлівасць прымянення забароны на прафесію ў рамках працэсу люстрацыі.





камуністычныя ідэолагі). Пры гэтым доступ да асобных сфер дзейнасці ці ўвогуле да магчымасці легальнай працы на падставе палітычнай і ідэалагічнай лаяльнасці (часам на аснове нацыянальна-культурнай або светапогляднай самаідэнтыфікацыі) рэгуляваўся пастаянна на розных этапах існавання СССР. Напрыклад, пэўныя пасты і пасады маглі займаць толькі члены КПСС, вернікам быў абмежаваны доступ да шырокага спектра прафесій, забарону на атрыманне пэўнай прафесійнай адукацыі мелі «асобы яўрэйскай нацыянальнасці» і г.д., і да т.п. Цэнзура і забарона літаратурных твораў аўтаматычна «выкідвалі» з прафесійнай рэалізацыі пісьменнікаў і паэтаў, «чорныя спісы» практыкаваліся ў дачыненні і да іншых творчых прафесійных груп.

Дзейнасць механізма забароны на прафесію як сродку барацьбы з іншадумствам у СССР вызначалася не толькі разнастайнасцю форм і адсутнасцю магчымасцей адстойваць свае правы ў судовым ці грамадскім парадку, але яшчэ і спецыфічнай арганізацыяй усяго сацыяльнага жыцця, якая і ідэалагічна, і структурна цэнтравалася на каштоўнасці працы і першаснасці сістэмы працоўных адносін. Забарона на прафесійную дзейнасць, звальненне з працы стваралі вельмі зручную для ўладаў форму маргіналізацыі і выцяснення непажаданых людзей з сацыяльнага жыцця як такога. Дзейнасць такога механізма абапіралася на тое, што праца была не проста правам, але абавязкам і «справай гонару» савецкага чалавека. Без уключанасці ў сістэму «грамадска-карыснай працы» людзі гублялі не толькі сродкі да існавання і сацыяльны статус, але і пазбаўляліся практычна ўсіх правоў. З 1961 года «дармаедства» ў СССР пераследавалася па законе, спачатку высылкамі з буйных гарадоў, пасля крымінальным пакараннем. Пры практычна поўнай адсутнасці недзяржаўнага сектара і наяўнасці крымінальнай адказнасці за «дармаедства», звальненне з працы і патраплянне ў «чорныя спісы» станавілася не проста эфектыўным інструментам маргіналізацыі іншадумцаў, але і часта першым крокам на шляху пазбаўлення антысавецкі настроеных людзей грамадзянскіх правоў праз крымінальны пераслед ці іншыя рэпрэсіўныя захады.

Пасля распаду СССР перыяд дэмакратычных пераўтварэнняў у Беларусі працягнуўся нядоўга, працэсы люстрацыі і дэсаветызацыі практычна не былі запушчаныя, таму ў выніку аўтарытарнага павароту шматлікія савецкія практыкі з лёгкасцю вярнуліся ў сацыяльна-палітычную рэальнасць, хаця і ў крыху змененым выглядзе. Аднаўленне практыкі забароны на прафесію стала формай барацьбы з палітычнай апазіцыяй і іншадумствам ужо на самых пачатковых этапах станаўлення аўтарытарнага палітычнага рэжыму.

У 2012 годзе Цэнтр еўрапейскай трансфармацыі ўпершыню правёў даследаванне практыкі прымянення забароны на прафесію ў Беларусі ў перыяд 1996-2011 гадоў[1]. У ходзе даследавання было зафіксавана больш за 500 публічна апісаных выпадкаў звальненняў і

[1] Гл.: **Запрет на профессию в Беларуси: разнообразие форм, задач и способов** // Центр европейской трансформации. — 12.09.2012: https://cet.eurobelarus.info/files/File/Berufsverbot-Belarus(1).pdf.

пазбаўлення магчымасці ажыццяўляць прафесійную дзейнасць па палітычных і ідэалагічных матывах. Гэтак жа, як і ў Савецкім Саюзе, у незалежнай Беларусі не было заканадаўча замацаваных абмежаванняў у сферы працоўных адносін, аднак паступова ўводзіліся розныя прававыя нормы, якія аблягчалі рэалізацыю забароны на прафесію. Так, у 2004 годзе ў краіне былі ўведзеныя абавязковыя кароткатэрміновыя працоўныя кантракты, і гэта развязала рукі дзейнаму палітычнаму рэжыму для лёгкага пазбаўлення ад непажаданых — шукаць спецыяльныя падставы для звальнення стала неабавязкова, можна было проста дачакацца заканчэння кантракта і адмовіцца яго працягваць без усялякіх тлумачэнняў. У 2015 годзе вяртаецца і савецкая практыка кантролю за «ўдзелам у грамадска-карыснай працы» («дэкрэт аб дармаедстве»***).

Для перыяду да 2020 года характэрнымі рысамі забароны на прафесію, што практыкуецца ў Беларусі, былі:

- «палітычная сезоннасць» звальненняў — яны ажыццяўляліся «прафілактычна» ў перыяд электаральных кампаній як пакаранне за праяўленую палітычную апазіцыйную актыўнасць;
- канцэнтрацыя на асобных прафесійных сферах: «ачыстка» сілавых структур і органаў дзяржкіравання ад іншадумцаў, звальненне грамадзянскіх і палітычных актывістаў са сфер, якія працуюць з грамадскай свядомасцю (СМІ, адукацыя, навука), выцясненне з публічнай прасторы аўтарытэтных людзей і патэнцыйных грамадскіх лідараў;
- прафесійная і сацыяльная маргіналізацыя і выцясненне ў менш сацыяльна абароненыя сектары (такія як НДА, прыватны сектар эканомікі і да т.п.) з меншымі магчымасцямі прафесійнай рэалізацыі;
- неканчатковы, часовы характар забароны на прафесію, калі для многіх пацярпелых ад яго прымянення магчымасць уладкавацца на працу па спецыяльнасці на працягу некаторага часу аднаўлялася.

У гэты перыяд звальненні, адлічэнні з навучальных устаноў, «чорныя спісы» былі сродкам запалохвання і пакарання палітычных апанентаў праз пазбаўленне іх сродкаў да існавання і магчымасцей для паўнавартаснай прафесійнай самарэалізацыі ў краіне. Таксама гэтыя метады служылі спосабам барацьбы з іншадумствам у дзяржаўных структурах, што дэманстраваў непазбежнасць сацыяльнай маргіналізацыі нязгодных.

Пры гэтым да 2020 года рэалізацыя забароны на прафесію ў Беларусі ўсё ж мела значныя адрозненні ад савецкіх практык. Найперш у сучаснай Беларусі адсутнічала (і ўсё яшчэ адсутнічае) поўная дзяржаўная манаполія на сферу працы і занятасці, а таксама

*** Так у народзе адразу ж быў празваны Дэкрэт прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 3 ад 2 красавіка 2015 года «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства».

самарэалізацыі чалавека. З развіццём прыватнага бізнесу і «трэцяга сектара» (некамерцыйных арганізацый і ініцыятыў, якія працуюць у розных сферах: ад зоаабароны да адукацыі і навукі), «эфектыўнасць» забароны на прафесію як рэпрэсіўнага інструмента зніжалася, паколькі прафесіяналы, выцесненыя з-за «нелаяльнасці» з дзяржаўных інстытуцый, мелі магчымасць рэалізавацца ў недзяржаўным сектары. На нейкім этапе забарону на прафесію можна было нават разглядаць як адзін з фактараў, што спрыяў развіццю недзяржаўнага сектара, які падсілкоўваўся прафесіяналамі высокага ўзроўню, нягледзячы на ніжэйшы ўзровень заробкаў і сацыяльнай абароненасці.

Аднак палітычны крызіс 2020 года карэнным чынам змяніў сітуацыю. Забарона на прафесію стала адной з масавых рэпрэсіўных практык, накіраваных не толькі супраць асобных грамадзян, удзельнікаў пратэстнага руху, іншадумцаў і нелаяльных дзеючаму ў краіне палітычнаму рэжыму, але і часткай стратэгіі ўладаў па пераўтварэнні сацыяльнай структуры, норм і адносін у грамадстве. У значнай ступені гэтае пераўтварэнне накіравана на **аднаўленне на новым матэрыяле савецкіх норм і ўзораў арганізацыі сацыяльнай і палітычнай рэальнасці**.

# Забарона на прафесію ў Беларусі: новы этап

У сітуацыі разгортвання палітычнага крызісу 2020 года і наступнага перыяду рэпрэсіўная практыка забароны на прафесію ў Беларусі стала адным з асноўных інструментаў падаўлення грамадзянскай палітычнай актыўнасці і іншадумства, нароўні з ужываннем гвалту, пазбаўленнем або абмежаваннем волі, запалохваннем, выцісканнем з краіны і да т.п. Ад папярэдніх перыядаў найноўшай гісторыі Беларусі прымяненне забароны на прафесію цяпер адрозніваецца не толькі маштабам, але і змяненнем форм і мэт.

Для больш глыбокага аналізу практыкі забароны на прафесію ў сённяшняй Беларусі і яе наступстваў для эканомікі і грамадства ў цэлым Цэнтр еўрапейскай трансфармацыі[2] сумесна з Лятучым універсітэтам[3] запусцілі маніторынгавае даследаванне. У дадзенай справаздачы вынікі першага этапу даследавання, якія ахопліваюць перыяд другой паловы 2020 года — першай паловы 2022 года[4], дапоўненыя дадзенымі за другую палову 2022 года разам з апісаннем новых выяўленых тэндэнцый.

**Мэтай даследавання** з'яўляецца аналіз рэалізацыі ў Беларусі практыкі забароны на прафесію ў 2020-2022 гадах і яе гуманітарных і сацыяльных эфектаў.

У лік **задач даследавання** ўваходзіла:

1) збор матэрыялу і аналіз выпадкаў забароны на прафесію;
2) вылучэнне асноўных характэрных рыс забароны на прафесію ў сучаснай сітуацыі (падставы, мэты і тактыкі дзеянняў уладаў, стратэгіі і тактыкі дзеянняў рэпрэсаваных);
3) вызначэнне ключавых праблем і іх наступстваў для грамадства і асобных людзей;
4) вызначэнне напрамкаў супрацьдзеяння негатыўным наступствам.

[2] **Цэнтр еўрапейскай трансфармацыі**, гл.: https://cet.eurobelarus.info.

[3] **Лятучы ўніверсітэт**, гл.: https://fly-uni.org.

[4] Гл.: **Практика «запрета на профессию» в Беларуси в 2020-2022 годах** // Центр европейской трансформации. — 08.11.2022: https://cet.eurobelarus.info/files/userfiles/22/DOC/2022_Berufsverbot-Belarus.pdf.

У якасці **эмпірычнай базы даследавання** выкарыстоўваліся[*I]:

- дадзеныя маніторынгу адкрытых крыніц (СМІ, Telegram-каналы) у перыяд са снежня 2020 года па снежань 2022 года (сабрана каля 300 кейсаў звальненняў або іншых відаў забароны на прафесію ў розных сферах);
- дадзеныя Беларускага ПЭН[5], сабраныя ў межах маніторынгу парушэнняў культурных правоў і правоў чалавека ў дачыненні да дзеячаў культуры ў частцы звальненняў у перыяд 2021-2022 гадоў у сферы культуры і сумежных сферах, непасрэдна звязаных з культурай (203 кейсы);
- дадзеныя аб звальненнях у сферы культуры, сабраныя Беларускай Радай культуры[6] да канца 2022 года (88 кейсаў);
- дадзеныя аб пацярпелых ад рэпрэсій медыкаў і работнікаў сферы аховы здароўя, сабраныя Фондам медыцынскай салідарнасці Беларусі[7] (219 кейсаў);
- вынікі анлайн-апытання, праведзенага ў межах дадзенага даследавання (палявы этап рэалізаваны ў траўні-чэрвені 2022 года, сабрана 141 анкета);
- вынікі глыбінных інтэрв'ю з пацярпелымі ад забароны на прафесію прадстаўнікамі розных сфер (1-ы этап: травень-чэрвень 2022 года, 20 інтэрв'ю; 2-і этап: жнівень-верасень 2022 года, 10 інтэрв'ю).

# 1. Формы і метады рэалізацыі забароны на прафесію

З улікам развіцця грамадскіх і эканамічных адносін, наяўнасці розных форм уласнасці і тыпаў занятасці, на дадзеным этапе мы ўключаем у абагульненую з'яву забароны на прафесію наступныя віды рэпрэсіўных дзеянняў з боку ўладаў:

1) **Звальненні.** Гэта найбольш універсальны і масава выкарыстоўваемы інструмент рэалізацыі забароны на прафесію, які прымяняецца сёння ва ўсіх сферах і на ўсіх узроўнях. У большасці выпадкаў звальненні адбываюцца з выкарыстаннем законных ці квазізаконных падстаў. У першую чаргу, гэта незаключэнне новага працоўнага кантракта

---

[*I] Аўтары даследавання ўдзячныя грамадзянскім арганізацыям і ініцыятывам, якія, нягледзячы на істотныя цяжкасці, працягваюць сістэмна і рупліва ажыццяўляць збор інфармацыі ў сваіх сферах.

[5] **Беларускі ПЭН**, гл.: https://penbelarus.org.

[6] **Беларуская Рада культуры**, гл.. https://byculture.org.

[7] **Фонд медицинской солидарности Беларуси**, гл.: https://bymedsol.org.

— паколькі ў асноўным працоўныя кантракты ў Беларусі маюць кароткатэрміновы характар (перазаключаюцца кожны год ці раз у два-тры гады), то гэта стала вельмі зручным спосабам пазбаўляцца ад непажаданых работнікаў. Значная частка такіх звальненняў адбываецца «па дамове бакоў», г.зн. нібы па ініцыятыве работніка (ён піша заяву на звальненне). Аднак гэты спосаб афармлення разрыву працоўных адносін толькі маскіруе рэальны ціск на работнікаў, якіх прымушаюць да такога кроку праз пагрозы звальнення «па артыкуле» ці іншых уздзеянняў. Акрамя таго, шырока прымяняецца практыка звальненняў па надуманых прычынах, калі работніку ставяцца ў віну парушэнні, якіх ён не здзяйсняў. Фактычна ад самага пачатку разгортвання практыкі забароны на прафесію на цяперашнім этапе людзей, якія адбывалі адміністрацыйны арышт («суткі») за ўдзел у акцыях пратэсту, сталі звальняць з працы «за прагулы», хаця па сутнасці гэта было незаконна. Сёння гэтая практыка «ўзаконеная» і працягвае распаўсюджвацца і на тых, хто трапляе «на суткі» за «распаўсюджванне экстрэмісцкіх матэрыялаў» (перапосты або лайкі ў сацыяльных сетках) альбо па іншых палітычна матываваных абвінавачаннях.

У справаздачы аб выніках першага этапу даследавання на аснове дадзеных апытання людзей, што пацярпелі ад забароны на прафесію, мы падрабязна аналізавалі механізмы і інструменты, якія выкарыстоўваюцца ў сітуацыях звальнення[8], тут жа абазначым толькі асноўныя характарыстыкі, якія якасна адрозніваюць новы этап:

- часцей за ўсё фіксуецца наяўнасць ініцыятывы «зверху»: складаемыя спецслужбамі і перадаваемыя для выканання кіраўнікам устаноў і прадпрыемстваў спісы з прозвішчамі пэўных працаўнікоў, якіх належыць звольніць; прамыя ўказанні ад супрацоўнікаў спецслужб або вышэйшага начальства; указанні звольніць усіх апазіцыйных актывістаў альбо датычных да тых ці іншых відаў пратэстнай актыўнасці (забастоўкі, незалежныя прафсаюзы) і да т.п.;
- адсутнасць завуаліраванасці і спроб схаваць рэальныя прычыны пераследу і звальненняў (часцей за іх ведаюць усе ўдзельнікі працэсу, у тым ліку ўсе людзі навакол, калегі);
- устаноўкі на тое, каб чалавек звольніўся сам: настойлівыя прапановы аформіць скасаванне працоўных адносін «па ўласным жаданні» або «па пагадненні бакоў»;
- працягласць ціску ў выпадку, калі сітуацыя не вырашаецца адразу: калі супрацоўнік не ідзе на «кампраміс», шукаюцца іншыя формы ціску і прымусу да звальнення альбо парушэнні, за якія можна звольніць «па артыкуле»;
- шантаж і ціск, у тым ліку пагрозы членам сям'і, пагрозы іншым супрацоўнікам або начальству.

[8] Гл.: **Практика «запрета на профессию» в Беларуси в 2020-2022 годах** // Центр европейской трансформации. — 08.11.2022: https://cet.eurobelarus.info/files/userfiles/22/DOC/2022_Berufsverbot-Belarus.pdf.

2) **Пазбаўленне ліцэнзій альбо неатэстацыя.** Адносна пазбаўлення ліцэнзій у нашай сітуацыі размова ідзе ў першую чаргу аб масавым працэсе пазбаўлення ліцэнзій на вядзенне адвакацкай дзейнасці. Пазбаўленне адвакатаў ліцэнзій адбываецца некалькімі спосабамі: а) па выніках атэстацый (пераатэстацый) кваліфікацыйнымі камісіямі; б) у сувязі з нібыта здзяйсненнем правін, несумяшчальных са званнем адваката. Акрамя таго, практыкуецца выключэнне адвакатаў з калегій рашэннямі дысцыплінарных камісій тэрытарыяльных калегій адвакатаў, што аўтаматычна пазбаўляе іх магчымасці ажыццяўляць прафесійную дзейнасць.

   Да гэтага ж тыпу забароны на прафесію можна аднесці звальненні, якія арганізуюцца праз працэдуру конкурса ці атэстацыі (для выкладчыкаў ВНУ і акадэмічных работнікаў), якую не праходзяць іншадумцы або заўважаныя ў апазіцыйнай палітычнай актыўнасці, а таксама пазбаўленне акрэдытацыі беларускіх журналістаў, якія працуюць на замежныя СМІ, што пазбаўляе іх магчымасці ажыццяўляць прафесійную дзейнасць у краіне на законных падставах.

   Сюды ж можна аднесці пазбаўленне ліцэнзій на тыя ці іншыя віды дзейнасці юрыдычных асоб (выдавецкая справа, медыцынскія паслугі ды інш.).

3) **Адлічэнні з ВНУ і іншых прафесійных навучальных установаў.** Студэнты, заўважаныя ў пратэстнай і апазіцыйнай актыўнасці, акцыях салідарнасці ці арганізацыі незалежных прафсаюзаў, адразу ж падвергліся масаваму адлічэнню з розных падстаў. Мы разглядаем гэтыя дзеянні ў якасці аднаго з відаў забароны на прафесію, бо яны перашкаджаюць атрыманню прафесійнай адукацыі і далейшай прафесійнай і працоўнай самарэалізацыі. Для адлічэнняў таксама часцей за ўсё знаходзіліся фармальныя падставы: «прагулы», «парушэнні дысцыпліны», няздача залікаў і іспытаў, якую заўсёды можна арганізаваць, і да т.п.

4) Адносна прадпрымальнікаў практыкуецца стварэнне **перашкод у вядзенні бізнесу**: пазбаўленне ліцэнзій, арганізацыя з боку інспекцыйных органаў бесперапынных праверак (падатковых, захавання правілаў пажарнай бяспекі і г.д.), што паралізуюць дзейнасць, атрыманне адмоў на арэнду або набыццё неабходных памяшканняў і да т.п.

5) **«Чорныя спісы»** — неафіцыйныя распараджэнні, негалосныя забароны на заключэнне творчых кантрактаў, трансляцыю ў медыях, прадастаўленне памяшканняў для выступаў ці творчых сустрэч. Гэты від забароны на прафесію пераважна датычыцца людзей творчых прафесій, перад якімі зачыняюцца ўсе дзверы і магчымасці прафесійнай самарэалізацыі. У нашай сітуацыі спецыфічна новым спосабам рэалізацыі гэтай практыкі стала стварэнне «экстрэмісцкіх спісаў», у якія трапляюць не толькі людзі, але і СМІ, арганізацыі, кнігі і часопісы. З дапамогай гэтага механізму людзі не проста выштурхваюцца з рынку працы, іх дзейнасць і ўсё, што з ёй звязана, крыміналізуецца.

6) **Ліквідацыя НДА і недзяржаўных СМІ.** Працэс ліквідацыі грамадскіх арганізацый любога тыпу, што носіць масавы характар, пакідае іх супрацоўнікаў без працы і сацыяльнай абароны, гэтак сама, як і закрыццё або выцясненне з краіны рэдакцый нацыянальных і рэгіянальных недзяржаўных СМІ. Ліквідацыя НДА ўсіх форм (асацыяцыі, фонды, грамадскія аб'яднанні, установы) праводзіцца таксама з захаваннем працэдурнага складніку, з выкарыстаннем судоў усіх узроўняў. Падставы для ліквідацыі часта носяць фармальны ці надуманы характар, акрамя таго, распаўсюджанай практыкай стала ліквідацыя НДА на падставе закрытай інфармацыі, прадстаўленай органамі пракуратуры ці іншымі дзяржструктурамі (г.зн. нават падчас судовага працэсу гэтыя падставы не агалошваюцца). Акрамя прымусовай ліквідацыі НДА, шырокае распаўсюджанне набыў таксама прымус да самаліквідацыі — калі кіраўніцтва арганізацый наўпрост (праз выклікі на размовы ў спецслужбы ці выканаўчыя камітэты) або ўскосна (з дапамогай бясконцых праверак, штрафаў і іншых перашкаджэнняў у дзейнасці) вымушаюць самастойна закрыць арганізацыю/ўстанову.

# 2. Працэс разгортвання новых практык забароны на прафесію ў 2020-2022 гадах

Грунтуючыся на маніторынгу паведамленняў у СМІ, аналізе дадзеных, якія збіраюцца рознымі грамадзянскімі ініцыятывамі, камунікацыі ў адкрытых і закрытых групах у сацыяльных сетках, можна прасачыць хcraналогію разгортвання рэпрэсіўнай практыкі забароны на прафесію ў якасці рэакцыі на палітычныя падзеі 2020 года.

Паведамленні аб распачаўшыхся звальненнях (у прыватнасці, за адмову фальсіфікаваць вынікі галасавання, удзел у акцыях пратэсту і спантанных страйках) сталі з'яўляцца літаральна ў першыя ж дні пасля прэзідэнцкіх выбараў. У гэты ж перыяд стала з'яўляцца інфармацыя аб добраахвотных звальненнях дзяржаўных служачых і сілавікоў на знак пратэсту супраць фальсіфікацыі выбараў і выявіўшыхся фактаў прымянення празмернага гвалту супрацоўнікамі сілавых структур пры разгоне акцый пратэсту.

Для апошніх (асабліва для супрацоўнікаў сілавых структур) звальненне з працы ў якасці пратэсту ў сітуацыі, калі ранейшы палітычны рэжым захоўвае кантроль над краінай, практычна аўтаматычна (за рэдкім выключэннем) пазбаўляла іх магчымасці вяртання на дзяржслужбу. У першыя тыдні пратэстаў таксама былі распаўсюджаны выпадкі, калі працаўнікі дзяржустаноў і арганізацый добраахвотна пакідалі іх на знак салідарнасці са звольненымі калегамі. Такія ўчынкі для гэтых людзей таксама сталі прычынай атрымання імі «ваўчынага білета», г.зн. патраплення ў «спісы нядобранадзейных» і пазбаўлення магчымасці далейшага працаўладкавання па спецыяльнасці.

Мэтанакіраваная «зачыстка» сістэмы дзяржслужбы ад кіраўнікоў арганізацый і чыноўнікаў, якія адкрыта падтрымалі пратэсты або паставіліся да іх лаяльна, пачалася ўжо з сярэдзіны жніўня 2020 года — адразу пасля арганізаванага ўладамі ў Мінску мітынгу ў падтрымку Аляксандра Лукашэнкі. Менавіта з гэтага моманту ў стужкі навін усё часцей сталі трапляць паведамленні аб звальненні з пасад кіраўнікоў установаў культуры, медыцыны, адукацыі, спорту, дзяржСМІ, а таксама аб звальненні супрацоўнікаў МЗС і пазбаўленні іх дыпламатычных рангаў.

На тле бесперапынных акцый пратэсту звальненням з працы адразу ж паўсюдна пачалі падвяргацца іх актыўныя ўдзельнікі, у першую чаргу тыя, хто абвясціў аб пачатку страйку і сыходзе ў стачку: работнікі дзяржСМІ, прамысловых прадпрыемстваў, выкладчыкі ВНУ і школ, медыцынскія работнікі і г.д.

У агульным шэрагу вылучыліся прафесійныя спартоўцы, якія адкрыта выступілі супраць фальсіфікацыі выбараў і гвалту — практычна ўсе з іх, незалежна ад спартыўных дасягненняў і заслуг, у першыя ж паслявыбарныя месяцы былі звольнены са зборных каманд сваіх відаў спорту.

Для прадстаўнікоў творчых прафесій, якія падтрымалі пратэсты, тут жа была адноўлена практыка «чорных спісаў» — забароны на выступ з канцэртамі, спектаклямі, правядзенне і ўдзел у выставах, на прысутнасць у тэле- і радыёэфірах дзяржСМІ і да т.п.

З пачаткам навучальнага года, калі пратэстная актыўнасць стала разгортвацца ва ўніверсітэцкіх сценах (студэнцкія акцыі, страйкі, петыцыі і звароты ад імя акадэмічнай супольнасці), пачаліся звальненні выкладчыкаў, самыя актыўныя ўдзельнікі пратэстаў і забастовак з ліку студэнтаў падвергліся адлічэнням.

Увесь гэты перыяд адбывалася няўхільнае пагаршэнне ўмоў для дзейнасці журналістаў з недзяржаўных медыяў. Абвінавачанні з боку ўладаў на адрас беларускіх незалежных і замежных медыяў у «каардынацыі пратэстаў» прагучалі яшчэ напярэдадні выбараў, але з сапраўдным пачаткам масавых выступаў гэтае абвінавачанне стала агульным месцам. 29 жніўня 2020 года беларускі МЗС пазбавіў акрэдытацыі некалькі дзясяткаў журналістаў замежных СМІ (не толькі заходніх, але і расійскіх), значная частка якіх з'яўлялася грамадзянамі Беларусі. За асвятленне акцый пратэстаў журналістаў пачалі затрымліваць і прыцягваць да адміністрацыйнай адказнасці нароўні з удзельнікамі акцый, адбывалася гэта на рэгулярнай аснове, як у сталіцы, так і ў рэгіёнах, а ўжо ў лістападзе некалькі журналістаў за сваю прафесійную дзейнасць былі падвергнутыя крымінальнаму пераследу і пасля асуджаныя да рэальных тэрмінаў зняволення. Далей гэтая практыка стане пастаяннай.

Адна з першых рэдакцый незалежных СМІ (інтэрнэт-выданне *Kyky.org*), асцерагаючыся пераследу, эвакуіравалася з Беларусі ўжо ў канцы жніўня 2020 года. З кастрычніка таго ж года пайшла чарада паведамленняў аб рэгулярных вобшуках, канфіскацыі аргтэхнікі,

блакаванні сайтаў, канфіскацыі тыражоў, судах, штрафах, затрыманні кіраўнікоў і супрацоўнікаў, а таксама аб закрыцці выданняў — як рэгіянальных, так агульнанацыянальных. З узмацненнем жорсткасці рэпрэсіўнага заканадаўства вясной 2021 года, дзейнасць незалежных грамадска-палітычных медыяў па сутнасці апынулася ў краіне пад забаронай — любая крытыка дзейных уладаў, асвятленне дзейнасці іх апанентаў і прадастаўленне тым слова кваліфікуецца як «экстрэмісцкая дзейнасць». Пік рэпрэсій супраць недзяржаўных медыяў прыпаў на канец вясны — лета 2021 года, калі былі зачыненыя самы чытаны інтэрнэт-партал *TUT.BY* і мінская студыя тэлеканала «Белсат» (травень 2021 года), рэдакцыя газеты «Наша Ніва» і карпункт «Радыё Свабода» (ліпень 2021 года), інфармацыйнае агенцтва БелаПАН (жнівень 2021 года). Супрацоўнікі гэтых і цэлага шэрагу іншых медыяў і прафесійных арганізацый журналістаў, што засталіся на волі, былі вымушаны экстранна пакінуць краіну і аднаўляць працу па-за яе межамі.

Рэпрэсіі былі інтэнсіфікаваныя з абвяшчэннем пачатку «Агульнанацыянальнай забастоўкі» з 26 кастрычніка 2020 года, на што рэжым адрэагаваў распараджэннем разабрацца з усімі, хто далучыўся да гэтага страйку. Прыкладна з гэтага моманту практыка рэалізацыі забароны на прафесію ў сітуацыі палітычнага крызісу набывае татальны характар. Паўсюдна пачаліся масавыя звальненні (а таксама адлічэнні студэнтаў) не толькі тых, хто далучыўся да страйку, але і «нядобранадзейных асоб» наогул: людзей, што прынялі актыўны ўдзел у перадвыбарчай кампаніі на баку незалежных кандыдатаў, у вулічных акцыях пратэсту альбо публічна асудзілі фальсіфікацыю выбараў і ўжыванне гвалту ў дачыненні да пратэстоўцаў, ды і наогул даўно звярнуўшых на сябе ўвагу сваімі апазіцыйнымі настроямі. На гэтым этапе актуалізавалася тэма праследу па палітычных матывах прыватных бізнесаў — многія з іх у выніку былі вымушаныя закрыцца, а іх уладальнікі пакінуць краіну.

У кастрычніку 2020 года былі адзначаны і першыя гучныя выпадкі пазбаўлення ліцэнзій адвакатаў, што займаліся абаронай палітвязняў. Пачынаючы з лютага 2021 года, гэтая практыка набыла масавы характар і рэалізуецца да гэтага часу, ёсць выпадкі і крымінальнага праследу адвакатаў.

На пачатку 2021 года з’явіліся першыя паведамленні аб складзеных спецслужбамі спісах людзей, што падлягаюць звальненню з працы за «нелаяльнасць» да палітычнага рэжыму, якія перадаваліся ва ўстановы, арганізацыі і на прадпрыемствы для абавязковага выканання. Па інфармацыі шэрагу медыяў, перш за ўсё такія спісы былі складзеныя ў дачыненні да ўласна супрацоўнікаў і вайскоўцаў сілавых ведамстваў, дзе «чысткі шэрагаў» былі праведзены ў першую чаргу і ў некалькі этапаў. Асноўны ж масіў паведамленняў аб масавых звальненнях людзей на падставе гэтых спісаў прыпаў на канец 2021 года.

Вядома, што ў якасці «асновы» для спісаў на звальненне выкарыстоўваліся спісы людзей, якія падпісаліся за вылучэнне незалежных кандыдатаў падчас перадвыбарнай кампаніі,

спісы незалежных назіральнікаў на выбарах, спісы людзей, якія падвергліся затрыманням і адбывалі адміністрацыйны арышт падчас акцый пратэсту жніўня-снежня 2020 года. У далейшым гэтыя спісы абнаўляліся і папаўняліся за кошт удзельнікаў страйкаў, актывістаў або стваральнікаў незалежных прафсаюзаў, шляхам выяўлення ў сацыяльных сетках тых, хто «негатыўна» выказваецца на адрас дзейных уладаў, а пасля — за кошт тых, хто ўдзельнічаў у акцыях пратэсту ды адкрыта асудзіў расійскую ваенную агрэсію супраць Украіны і да т.п.[*II]

Улетку 2021 года пачалося масавае прымяненне яшчэ аднаго віду забароны на прафесію — ліквідацыя некамерцыйных арганізацый (грамадскіх аб’яднанняў, установ, фондаў, ініцыятыў і да т.п.). У сярэдзіне ліпеня ў рэжыме спецаперацыі адначасова па ўсёй краіне адбылісяператрусы ў офісах дзясятка найбольш уплывовых арганізацый, быў затрыманы шэраг вядомых актывістаў сектара, адначасова з гэтым Мінюст абвясціў пра ліквідацыю некалькіх соцень НДА. З гэтага моманту практыка ліквідацыі НДА розных форм набыла сістэмны і пастаянны характар.

З лета 2021 года пачынае ўводзіцца шэраг заканадаўчых змен, якія палягчаюць практыку забароны на прафесію. 30 чэрвеня 2021 года ў Працоўным кодэксе з’явілася новая падстава для скасавання працоўнай дамовы па ініцыятыве наймальніка — адсутнасць на працы з прычыны адбывання адміністрацыйнага арышту, калі гэта перашкодзіла выкананню працоўных абавязкаў[9]. Такім чынам была легалізавана магчымасць звальнення любога работніка, які падвергся адміністрацыйнаму арышту па рашэнні суда ці нават проста папярэдняму затрыманню на двое-трое сутак. Да падвергнутых адміністрацыйнаму пакаранню па палітычных матывах гэтая мера ў дзяржаўных установах і арганізацыях пачала ўжывацца амаль у аўтаматычным рэжыме.

Пазней былі ўнесеныя змены і ў іншыя законы і падзаконныя акты, якія альбо ўзмацняюць кантроль за «ідэалагічна нелаяльнымі», альбо ўзмацняюць рэгламентацыю доступу да прафесіі ў розных сферах дзейнасці.

У 2022 годзе пачала з’яўляцца інфармацыя аб выпадках адмовы ў прыёме на працу або схаваных звальненнях у дачыненні да сваякоў палітычных зняволеных. У незалежных СМІ згадваліся адзінкавыя выпадкі такога кшталту ціску, у асноўным у дачыненні да публічных асоб, аднак, мяркуючы па ўсім, гэтая практыка значна шырэйшая. Чыннікі такіх дзеянняў таксама не вельмі хаваліся наймальнікамі (у беларускай практыцы гэта выказваецца

[*II] У 2023 годзе, які не ўваходзіць у разглядаемы перыяд, з’явілася інфармацыя, што ў некаторых арганізацыях складаюць спісы на звальненне (на непрацягненне кантрактаў) проста па прынцыпе «нелаяльнасці», г.зн. не на аснове нейкіх канкрэтных фактаў, а на аснове ацэнкі асобы.

[9] Гл.: **Статья 42. Расторжение трудового договора по инициативе нанимателя.** Трудовой кодекс Республики Беларусь от 26 июля 1999 года № 296-З // Эталон-online: https://etalonline.by/document/?regnum=hk9900296.

распаўсюджанай фразай: «Ну, вы ж самі ўсё разумееце»), у некаторых выпадках працадаўцы спасылаліся на «распараджэнні зверху».

Да канца 2022 года праявілася яшчэ адна тэндэнцыя рэалізацыі забароны на прафесію, якая не ўносіць прынцыпова новых форм і метадаў, аднак сімптаматычная для характарыстыкі агульнага працэсу. Гэта «кадравыя чысткі» ў дзяржаўных установах і на прадпрыемствах, якія ініцыіруюцца пры змене кіраўніцтва або пры прызначэнні новых «намеснікаў па ідэалагічнай рабоце і бяспецы». На этапе 2020-2021 года мы назіралі, што непасрэднае кіраўніцтва арганізацый, якое само знаходзілася пад жорсткім кантролем і ціскам «зверху», часта старалася пазбягаць звальнення сваіх работнікаў, заўважаных у «нелаяльнасці», у тым ліку і таму, што пазбаўленне ад каштоўных спецыялістаў магло выклікаць кадравыя праблемы, стварыць напружанасць ва ўзаемаадносінах унутры працоўных калектываў. Цяпер жа ствараецца ўражанне, што ўступленне на пасаду для новага кіраўніка спалучана з выкананнем «рытуала» пацверджання ўласнай лаяльнасці шляхам пазбаўлення ад «нелаяльных» работнікаў[*III].

# 3. Маштабы рэалізацыі забароны на прафесію ў 2020-2022 гадах

На сённяшні дзень няма магчымасці аб’ектыўна даць ацэнку маштабу з’явы, і незразумела, ці магчыма гэта ў прынцыпе.

Па-першае, нягледзячы на тое, што сама ўстаноўка на «чысткі» публічна агучваецца ў мэтах запалохвання «нелаяльных», на практыцы вялікі масіў звальненняў і іншых відаў рэалізацыі забароны на прафесію адбываецца ва ўтоеным, фармальна завуаляваным выглядзе. Ад людзей дамагаюцца рашэнняў звольніцца самастойна, каб «не псаваць жыццё» сабе і іншым, шырока выкарыстоўваюцца магчымасці непрацягнення кантрактаў, неатэстацыя (пазбаўленне ліцэнзій), непраходжанне па конкурсе (для акадэмічных работнікаў) і г.д.

Па-другое, большасць выпадкаў застаецца непублічнай, і з узмацненнем рэпрэсій у публічную прастору трапляе ўсё менш інфармацыі. Чым далей, тым больш працуе ўстаноўка, што публічнасць можа перашкодзіць працаўладкавацца ў іншым месцы, больш за тое, апублічванне сітуацыі звальнення па палітычных матывах можа прыводзіць не толькі да праблем з пошукам новай працы, але і да іншых, яшчэ больш жорсткіх відаў пераследу. Таму калі ў 2020-м і нават яшчэ ў 2021-м годзе людзі не хавалі, што іх звальняюць з-за іх грамадзянскай пазіцыі ці ўдзелу ў пратэстным руху, то на сённяшні

[*III] Адзначым, што ў канцы 2022 года з'явілася інфармацыя аб самых першых выпадках такіх «чыстак», у 2023 годзе іх колькасць павялічылася.

дзень у публічную прастору трапляюць альбо гісторыі людзей, якія пасля звальнення з'ехалі з Беларусі і знаходзяцца ў бяспецы, альбо ананімныя выпадкі, альбо кейсы «масавых чыстак», якія цяжка схаваць.

Падчас маніторынгу СМІ мы знайшлі каля 300 апісаных выпадкаў звальненняў па палітычных матывах у перыяд са снежня 2020 года па снежань 2022 года. Нельга сцвярджаць, што атрыманае намі размеркаванне публічных згадак па сферах адлюстроўвае рэальную карціну, важна хутчэй падкрэсліць разнастайнасць сфер дзейнасці, у якіх гэтыя выпадкі фіксуюцца: ад пракуратуры да царквы, ад СМІ да медыцыны. Не маючы магчымасці рэальна ацаніць колькасны маштаб праблемы, мы можам казаць аб распаўсюджванні яе на ўсе сферы прафесійнай дзейнасці.

**Дыяграма.** Згадванні ў СМІ выпадкаў звальненняў па сферах, %




У некаторых прафесійных галінах існуюць грамадзянскія ініцыятывы, якія робяць больш ці менш сістэматычны збор дадзеных пра выпадкі забароны на прафесію. Такія ініцыятывы ёсць у адвакацкай супольнасці (праект «Права на абарону»[10]), сферы культуры (Беларускі ПЭН[11] і Беларуская Рада культуры[12]), сферы медыцыны і аховы здароўя (Фонд медыцынскай

[10] **«Право на Защиту»**, гл.: https://www.defendersbelarus.org.

[11] **Беларускі ПЭН**, гл.: https://penbelarus.org.

[12] **Беларуская Рада культуры**, гл.: https://byculture.org.

салідарнасці Беларусі[13]), незалежных СМІ (Беларуская асацыяцыя журналістаў[14], *Media Solidarity Belarus*[15]). Іх дадзеныя грунтуюцца на збіранні інфармацыі з адкрытых крыніц, метадам «снежнага кома» або праз улік тых, хто звярнуўся па дапамогу. Астатнія прафесійныя супольнасці не вядуць і такога ўліку[*IV].

У пераліку сфер прафесійнай дзейнасці, якія найбольш пацярпелі ад забароны на прафесію пасля падзей 2020 года, можна назваць адвакатуру, сектар некамерцыйных арганізацый (НДА) і недзяржаўныя медыя — у тым сэнсе, што гэтыя сферы на сённяшні дзень унутры Беларусі калі не поўнасцю ліквідаваныя, то знаходзяцца практычна на мяжы знікнення.

У сферы адвакатуры да канца 2022 года колькасць спецыялістаў, гатовых брацца за абарону палітзняволеных, стала крытычна нізкай, у шэрагу рэгіёнаў такіх не засталося зусім (пры тым што колькасць палітвязняў у краіне ўвесь час расце). Па дадзеных на канец 2022 года, як мінімум 87 адвакатаў было пазбаўлена права на прафесійную дзейнасць (дзевяць з іх зазналі крымінальны пераслед)[*V].

Сістэматычная «зачыстка» «трэцяга сектара» (НДА розных форм) пачалася ў ліпені 2021 года і працягваецца да цяперашняга часу. Сектар некамерцыйных арганізацыі і ініцыятыў займае невялікі сегмент на рынку працы, але сам тып занятасці ў ім забяспечваў магчымасці свабоднага самавыяўлення і развіцця і, акрамя таго, адноснай незалежнасці ад існуючага палітычнага рэжыму. Сёння ён аказаўся практычна знішчаны. Па дадзеных маніторынгу *Lawtrend*, да канца 2022 года сектар пазбавіўся як мінімум 1173 некамерцыйных арганізацый (грамадскіх аб'яднанняў, прафесійных саюзаў, фондаў, недзяржаўных устаноў і асацыяцый)[16]. 757 з іх падвергліся прымусовай ліквідацыі, 416 былі вымушаны самаліквідавацца[*VI].

---

[13] **Фонд медицинской солидарности Беларуси**, гл.: https://bymedsol.org.

[14] **Беларуская асацыяцыя журналістаў**, гл.: https://baj.by.

[15] **Media Solidarity Belarus**, гл.: https://sites.google.com/belarus97.pro/media.

[*IV] Трэба адзначыць, што ініцыятывы па аказанні дапамогі рэпрэсіраваным (у тым ліку і тым, хто страціў працу) існуюць і ў іншых прафесійных супольнасцях, аднак яны не засяроджаныя на сістэмным зборы інфармацыі.

[*V] Па стане на чэрвень 2023 года гэта лічба вырасла да 110 адвакатаў.

[16] Гл.: **Ситуация со свободой ассоциаций и организациями гражданского общества Республики Беларусь: обзор за декабрь 2022 г.** // Lawtrend: https://www.lawtrend.org/freedom-of-association/situatsiya-so-svobodoj-assotsiatsij-i-organizatsiyami-grazhdanskogo-obshhestva-respubliki-belarus-obzor-za-dekabr-2022-g.

[*VI] Да жніўня 2023 года гэта лічба ўзрасла да 1407 (900 НКА, у дачыненні да якіх прынятае рашэнне аб прымусовай ліквідацыі, і 507 самаліквідаваных) (гл.: **Ситуация со свободой ассоциаций и организациями гражданского общества Республики Беларусь: обзор за август 2023 г.** // Lawtrend: https://www.lawtrend.org/freedom-of-association/situatsiya-so-svobodoj-assotsiatsij-i-organizatsiyami-grazhdanskogo-obshhestva-respubliki-belarus-obzor-za-avgust-2023-g).





Беларускія недзяржаўныя медыя ўнутры краіны таксама практычна перасталі існаваць. Магчымасці ажыццяўляць прафесійную дзейнасць пазбавіліся не проста асобныя журналісты, а цэлыя прафесійныя калектывы, былі знішчаны або выцеснены ў эміграцыю рэдакцыі і журналісцкія прафесійныя арганізацыі са шматгадовай гісторыяй.

Па звестках Беларускай асацыяцыі журналістаў (БАЖ), на момант ліпеня 2022 года Беларусь вымушана пакінула больш за 400 журналістаў. Інтэрнэт-рэсурсы практычна ўсіх беларускіх медыяў, якія працуюць з-за мяжы, на сённяшні дзень абвешчаны ў Беларусі «экстрэмісцкімі матэрыяламі» і нават «экстрэмісцкімі фармаваннямі», за падпіску на іх акаўнты і рэпосты іх публікацый людзі ўнутры краіны падвяргаюцца адміністрацыйнаму і крымінальнаму пераследу.

Застаўшаяся ў краіне не такая ўжо вялікая колькасць, у параўнанні з папярэднімі гадамі, незалежных СМІ перажывае значныя абмежаванні і цяжкасці ў сваёй дзейнасці, знаходзяцца пад пастаяннай пагрозай: у 2022 годзе БАЖ зафіксаваў 43 выпадкі затрыманняў журналістаў і 55 вобшукаў, 33 прадстаўнікі медыясектара на канец 2022 года знаходзіліся ў зняволенні[17].

Сярод іншых сфер, што сур'ёзна пакутуюць ад палітычна матываваных звальненняў і «чыстак», можна адзначыць медыцыну, адукацыю і культуру. Аналіз дадзеных, сабраных ініцыятывамі, якія працуюць з гэтымі канкрэтнымі прафесійнымі сферамі, дазваляе меркаваць, што пік «чыстак» у сферы культуры, навукі і адукацыі прыпаў на кастрычнік-снежань 2021 года, пасля гэтага колькасць фіксуемых звальненняў або іншых форм забароны на прафесію крыху знізілася. Аднак, чым далей, тым цяжэй ацэньваць маштаб таго, што адбываецца, шляхам аналізу адкрытых крыніц — людзі, якія трапляюць пад рэпрэсіі, усё больш пазбягаюць апублічвання сваёй сітуацыі (ва ўсялякім разе, тыя, хто застаецца ў Беларусі), у той жа час магчымасці маніторынгу сітуацыі ў праваабарончых арганізацый і недзяржаўных СМІ таксама няўхільна змяншаюцца. Відавочна таксама, што маштабы звальненняў у гэтых сферах значна шырэйшыя, чым можна зафіксаваць шляхам аналізу адкрытых крыніц або праз звароты пацярпелых[*VII].

На сённяшні дзень мы можам ацаніць толькі сукупны эфект уздзеяння на гэтыя сферы ўсяго комплексу негатыўных фактараў, якія з'яўляюцца следствам разгортвання палітычнага крызісу 2020 года: забароны на прафесію, эміграцыі работнікаў з краіны па палітычных і

[17] Гл.: **СМІ ў Беларусі ў 2022 годзе** // Беларуская асацыяцыя журналістаў. — 30.03.2023: https://baj.by/be/analytics/smi-u-belarusi-u-2022-godze-0.

[*VII] Так, паводле дадзеных, сабраных Беларускай Радай культуры, з 88 чалавек, якія падвергліся рэпрэсіям у сферы культуры, толькі 20 паведамілі, што яны не ведаюць фактаў іншых звальненняў у іх арганізацыі. Усе астатнія сведчылі аб тым, што яны не адзіныя звольненыя ў сваёй арганізацыі.

эканамічных прычынах, сыходу людзей з прафесіі з прычыны псіхалагічнага фону і ціску, агульнай эканамічнай сітуацыі.

Дадзеныя Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь паказваюць, што ў 2020-2021 гадах ва ўсіх гэтых трох сферах назіраўся значны адток кадраў. У галіне адукацыі розніца паміж прынятымі на працу і звольненымі была адмоўнай і да 2020 года, аднак аб'ёмы кадравых страт у 2020 годзе ўзраслі ў разы. У галіне ж аховы здароўя і культуры (творчасць, спорт, забавы, адпачынак) у 2018-2019 годзе назіралася станоўчая дынаміка, якая змянілася ў 2020 годзе на рэзка адмоўную[*VIII].

**Табліца.** Розніца паміж прынятымі на працу і звольненымі па сферах дзейнасці, 2018-2022 гады[18]

| Сфера | Розніца паміж прынятымі на працу і звольненымі | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | **2022** | **2021** | **2020** | **2019** | **2018** |
| Адукацыя | -4956 | -7870 | -9232 | -1817 | -2691 |
| Ахова здароўя і сацыяльныя паслугі | 2111 | -1851 | -2959 | +1158 | +1909 |
| Творчасць, спорт, забавы, адпачынак | -269 | -1047 | -4784 | +405 | +244 |

Калі верыць афіцыйнай статыстыцы, то ў сферы аховы здароўя адмоўны трэнд у 2022 годзе быў пераадолены, тым не менш, калі арыентавацца на сярэдняспісачную колькасць па гэтых сектарах эканомікі, то сектар аховы здароўя ў параўнанні з «дакрызісным» 2019 годам скараціўся мінімум на 2% працаўнікоў, адукацыя — на 5,7%, сектар «творчасць, спорт, забавы, адпачынак» — на 8,6%[19]. Нават з усімі дапушчэннямі наконт таго, што ўлічвае, а што не ўлічвае сістэма дзяржаўнай статыстыкі, гэтыя страты можна ацэньваць як дастаткова сур'ёзныя. Пытанне зніжэння якасці кадраў у гэтых сферах у выніку пастаянных «чыстак» даволі шмат абмяркоўваецца ў СМІ, але для аб'ектыўнай ацэнкі патрабуе дадатковага даследавання.

[*VIII] Варта ўлічваць, што беларуская дзяржаўная статыстыка мае шэраг недахопаў, звязаных і з выкарыстоўваннем статыстычных катэгорый, і з метадамі збору інфармацыі, таму ставіцца да яе дадзеных трэба з некаторай доляй асцярожнасці.

[18] Крыніца: штогадовыя справаздачы Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь «Колькасць, заработная плата работнікаў, выдаткі арганізацый Рэспублікі Беларусь на працоўную сілу», разлікі аўтараў.

[19] Там жа.

# 4. Устаноўкі на рэсаветызацыю ў рэалізацыі забароны на прафесію

Адзначым шэраг істотных момантаў, якія характарызуюць ажыццяўляемую на бягучым этапе практыку забароны на прафесію ў Беларусі як працэс рэсаветызацыі, г.зн. вядуць да аднаўлення савецкіх норм і практык не толькі ў працоўных, але і ў сацыяльных адносінах у цэлым.

**Татальнае выцясненне і кантроль.** Цяперашні этап рэалізацыі забароны на прафесію разгортваецца такім чынам, каб забяспечыць не толькі «пакаранне» за ўчынак, дзеянне, выказванне сваёй пазіцыі, але і цалкам выцесніць «нелаяльных» з сістэмы працоўных адносін. Для таго, каб забяспечыць кантраляванасць працэсу і пазбавіць звольненага шанцаў на працаўладкаванне ў іншым месцы, ствараюцца спісы і базы, па якіх аддзелы кадраў (ці ідэалагічныя аддзелы) абавязаны звяраць усіх суіскальнікаў. Замацоўваюцца, у тым ліку і заканадаўча, і іншыя інструменты кантролю, якія прэтэндуюць на паўнату і татальнасць.

Так, з 12 кастрычніка 2021 года адбыліся змены ў патрабаваннях для характарыстык з ранейшага месца працы[20], якія неабходныя для ўладкавання на працу ў дзяржаўныя арганізацыі і ўстановы, а таксама арганізацыі з 50% долі дзяржаўнай уласнасці. Першым чынам наймальнік цяпер *абавязаны* запатрабаваць такую характарыстыку. Змяніліся і патрабаванні да зместу характарыстыкі работніка, зараз яна абавязкова павінна ўключаць у сябе наступныя дадзеныя:

- аб стаўленні да дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў, канстытуцыйнага ладу;
- аб здзейсненых дзеяннях супраць парадку кіравання і грамадскай бяспекі, наяўнасці антыдзяржаўных праяў работніка на працоўным месцы[21].

Каментуючы гэтыя новаўвядзенні, кіраўнік Міністэрства працы і сацабароны Ірына Касцевіч не хавала іх прызначэння: «Разам з тым, падзеі, якія мелі месца ў 2020 годзе, паказалі неабходнасць прыняцця дадатковых мер, у тым ліку і заканадаўчага плана, па

---

[20] Гл.: **Руководителей госорганов обязали при приеме граждан на работу запрашивать характеристики с предыдущей работы** // БелТА. — 12.10.2021: https://www.belta.by/president/view/rukovoditelej-gosorganov-objazali-pri-prieme-grazhdan-na-rabotu-zaprashivat-harakteristiki-s-464116-2021/.

[21] Гл.: **Постановление Совета министров Республики Беларусь от 14 октября 2021 года № 585 «О форме характеристики»** // Pravo.by: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=C22100585.

недапушчэнні пранікнення ў дзяржаўныя органы і арганізацыі дэструктыўна настроеных грамадзян, якія адкрыта выступаюць супраць палітычнага курсу нашай дзяржавы»[22].

Такім чынам, у практыку працаўладкавання ўключаны пункт аб палітычнай лаяльнасці і добранадзейнасці. З улікам шырокага сектара эканомікі з дзяржаўным удзелам, такое патрабаванне ператвараецца ў «чорную метку» для ўсіх заўважаных у «нелаяльнасці» да існуючага рэжыму. Акрамя таго, ва ўмовах агульнага рэпрэсіўнага фону і запалохвання гэты пункт становіцца важным і для арганізацый прыватнай формы ўласнасці, для якіх новыя патрабаванні не абавязковыя, аднак відавочна прапануюцца ў якасці ўзору для пераймання і практыкі, якая можа засцерагчы іх уласны бізнес.

Увядзенне спецыяльных пунктаў характарыстыкі дэманструе спробу тэхналізацыі працэсу і ўстаноўку на татальнае недапушчэнне палітычна «нелаяльных» асоб да рынку працы. Гэта адбіваецца як на наступствах для асобных людзей, так і на ўплыве працэсу масавых звальненняў на грамадства ў цэлым.

**Прамое ўмяшанне спецслужбаў.** Пытанні аб звальненні (асабліва па спушчаных «зверху» спісах) цяпер вельмі часта вырашаюцца не ў сістэме адносін «работнік—адміністрацыя», а ў адносінах «працоўны калектыў (у тым ліку, нярэдка ўключаючы кіраўніка) — рэпрэсіўныя дзяржорганы (КДБ, міністэрствы, выканкамы)». Непасрэдныя кіраўнікі часта аказваюцца або простымі выканаўцамі спушчаных «зверху» указанняў, або ў сітуацыі «паміж молатам і кавадлам» (калі, спрабуючы нейкім чынам абараніць супрацоўнікаў, самі трапляюць пад ціск і звальненні).

Характэрным у гэтым рэчышчы можна лічыць вядомыя факты змены ў дзяржустановах і на прадпрыемствах кіраўнікоў вышэйшага і сярэдняга звяна на людзей, якія маюць альбо мелі непасрэднае дачыненне да сілавых структур. Пашыраюцца паўнамоцтвы і ўводзяцца новыя пазіцыі спецыялістаў або намеснікаў «па ідэалагічнай рабоце і бяспецы», на якіх ускладаецца функцыя палітычнага і ідэалагічнага кантролю працоўных калектываў. У асобных галінах і арганізацыях ніводнае кадравае рашэнне не прымаецца без узгаднення з «ідэалагічнымі работнікамі», часам пытанні найму і звальнення работнікаў пераходзяць цалкам у іх кампетэнцыю.

Такім чынам, мы назіраем аднаўленне савецкай практыкі ідэалагічнага кантролю і кантролю спецслужбаў, якому падпарадкоўваецца непасрэдная вытворчасць і любая дзейнасць арганізацый увогуле.

**Вяртанне прынцыпу распаўсюджвання пакарання за «нелаяльнасць» на членаў сям'і, сваякоў.** Паступова пашыраецца практыка, калі забароне на прафесію (як

[22] Гл.: **Министр труда и соцзащиты уточнила, когда наниматель обязан запрашивать характеристику на работника** // «Экономическая газета». — 10.11.2021: https://neg.by/novosti/otkrytj/ministr-truda-i-soczaschity-pro-harakteristiku-na-rabotnika/.

і іншым відам рэпрэсій) падвяргаюцца сваякі палітычных зняволеных, публічна вядомых актывістаў, вымушаных эмігрантаў, якія працягваюць палітычную актыўнасць за межамі краіны. У рэдкіх выпадках такія дзеянні можна інтэрпрэтаваць як спробы ціску на саміх актывістаў, у большасці іх яны не маюць ніякай іншай прагматычнай мэты, акрамя маргіналізацыі не толькі саміх апазіцыйна настроеных грамадзян, але і членаў іх сем'яў. Такім чынам улады спрабуюць узмацніць стыгматызацыю нелаяльнасці і іншадумства, вяртаючыся да савецкай практыкі рэпрэсій, калі пераследу падвяргаліся цэлыя сем'і.

**Ліквідацыя сацыяльных лакун і ніш для іншадумцаў.** У папярэднія гады людзі, якія падвяргаліся забароне на прафесію, часта знаходзілі магчымасці для самарэалізацыі (ці хаця б выжывання) у недзяржаўным сектары (НДА і прыватным бізнесе). Будучы не занадта шырокімі і развітымі, гэтыя сферы тым не менш маглі кааптаваць тых, каго спрабавалі выцесніць з прафесійнай дзейнасці, сацыяльнага жыцця і эканамічных адносін. Падчас бягучай кампаніі масавых палітычных рэпрэсій пераважная большасць грамадскіх арганізацый і недзяржаўных медыяў у краіне была паказальна знішчана, былі створаны значныя цяжкасці для працы як індывідуальных прадпрымальнікаў, так і больш буйнога прыватнага бізнесу. Недзяржаўны сектар эканомікі скарачаецца, акрамя таго, структуры, якія працягваюць функцыянаваць, бяруцца пад значна больш жорсткі ідэалагічны кантроль, чым калі б там ні было. Узмацняецца жорсткасць рэгламентацыі і прымаюцца новыя законы аб ліцэнзаванні дзейнасці ў тых сферах, дзе раней існавала адносная свабода. Пастунова гэта вядзе да аднаўлення дзяржаўнага кантролю над усёй сферай працоўных адносін, як гэта было ў савецкія часы, хоць і з захаваннем розных форм уласнасці і тыпаў занятасці, фармальнага існавання грамадскіх арганізацый і да т.п.

# 5. Фактары, што перашкаджаюць паўнаце аднаўлення савецкіх практык і татальнага кантролю

Рэалізацыі ўстаноўкі дзейных уладаў на аднаўленне поўнага кантролю над грамадствам, у тым ліку пры дапамозе практыкі забароны на прафесію, перашкаджае шэраг фактараў, якія істотным чынам адрозніваюць сітуацыю на цяперашнім этапе ад усіх папярэдніх. Разгледзім асноўныя з іх.

**Грамадскія настроі і агульны сацыяльна-псіхалагічны фон.** Важнай часткай сітуацыі рэалізацыі забароны на прафесію з'яўляецца рэакцыя асяроддзя. На папярэдніх гістарычных этапах арганізацыя «грамадскага ганьбавання», мобінгу ці булінгу з боку калег з'яўлялася важнай часткай практыкі забароны на прафесію, як у СССР, так і ў незалежнай

Беларусі. Карэнным адрозненнем сітуацыі пасля 2020 года з’яўляецца ўзросшы ўзровень салідарнасці і сацыяльнай падтрымкі людзей, якія падвергліся тым ці іншым відам рэпрэсій. Выступленні супраць дзейнага ў краіне аўтарытарнага рэжыму сталі самымі маштабнымі з моманту яго ўсталявання. Метафарычныя «97%» паказвалі, што не проста павялічылася колькасць людзей, апазіцыйна настроеных да дзейных уладаў, але, што важней, яны адчулі сябе большасцю, знаходзілі пацверджанні, што іх пазіцыя і дзеянні не маргінальныя і выключныя, а шырока падзяляюцца.

На хвалі грамадска-палітычнага ўздыму 2020-2021 года людзі, якія патрапілі пад забарону на прафесію, як правіла, захоўвалі ўпэўненасць у сваёй праваце і адчувалі падтрымку з боку свайго атачэння, як у прафесійным асяроддзі, так і ў сяброўскім і сямейным коле[23]. Гэта значыць, нягледзячы на аб’ектыўныя праблемы, сітуацыя мела пазітыўны псіхалагічны і маральны фон.

У гэты ж перыяд нярэдкімі былі выпадкі звальнення на знак салідарнасці і пратэсту — з’ява, характэрная менавіта для 2020-2021 года. Размова ідзе перш за ўсё аб дзяржаўных установах і прадпрыемствах, праца ў якіх патрабуе заняцця канкрэтнай палітычнай і ідэалагічнай пазіцыі. Адмова ад саўдзелу ў злачынных дзеяннях, нежаданне быць часткай рэпрэсіўнай і ідэалагічнай машыны, крытычнае разыходжанне ў этычных і маральных прынцыпах сталі падставамі для шматлікіх звальненняў. Яркія публічныя кейсы такога кшталту звальненняў (з Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, Міністэрства замежных спраў, тэле- і радыёкампаній, ВНУ і да т.п.) падмацоўвалі ўпэўненасць людзей, якія падвергліся звальненням за выказванне сваёй грамадзянскай пазіцыі, у маральна-этычнай правільнасці сваіх дзеянняў.

З узмацненнем рэпрэсій і ўсё большай «закрытасцю» сітуацыі, узмацненнем устаноўкі на адмову апублічваць свае выпадкі траплянне пад забарону на прафесію, зыходам пратэстнай актыўнасці ў паўпадпольны (а пасля і цалкам падпольны) стан, грамадская падтрымка ўжо не адчуваецца як масавая, аднак яна захоўваецца як у рэферэнтных групах, так і ў шырэйшым асяроддзі.

**Узровень развіцця грамадзянскай супольнасці.** Падзеі 2020 года праявілі дасягнуты ўзровень развіцця грамадзянскай супольнасці ў Беларусі і адначасова паслужылі штуршком да бурнага фарміравання новых супольнасцей, ініцыятыў і структур. Першыя дзейныя адказы з боку грамадзянскай супольнасці на прымяненне практык забароны на прафесію супраць удзельнікаў пратэстнага руху з’явіліся ўжо ў жніўні 2020 года[*IX], з

[23] Гл.: **Практика «запрета на профессию» в Беларуси в 2020-2022 годах** // Центр европейской трансформации. — 08.11.2022: https://cet.eurobelarus.info/files/userfiles/22/DOC/2022_Berufsverbot-Belarus.pdf.

[*IX] Ужо праз тыдзень пасля дня выбараў узнік Фонд салідарнасці *BYSOL*, адной з мэт якога была на той момант «дапамога грамадзянам, якія страцілі працу ў сувязі з удзелам у акцыях пратэсту супраць вынікаў выбараў у Беларусі», а таксама падтрымка дзяржаўных служачых і сілавікоў, гатовых пакінуць свае пасады ў знак пратэсту.

павелічэннем колькасці выпадкаў звальненняў па палітычных матывах павялічвалася і колькасць ініцыятыў, якія аказваюць дапамогу пацярпелым ад забароны на прафесію. Гэта ініцыятывы, якія сфармаваліся ў прафесійных супольнасцях (журналістаў, дзеячаў культуры, адвакатаў, медыкаў, настаўнікаў, вучоных, спартсменаў, рабочых), фонды салідарнасці і арганізацыі шырокага праваабарончага профілю.

Па меры практычна поўнага выцяснення актыўных структур грамадзянскай супольнасці за межы краіны, іх дзейнасць і магчымасці ўсё больш пераарыентуюцца на дапамогу тым, хто апынуўся ў вымушанай эміграцыі. І хоць вырашыць асноўную праблему, звязаную з пошукам новай працы, гэтыя структуры часцей за ўсё не ў стане, аднак яны аказваюць дапамогу ў спадарожных працэсах: у легалізацыі, пацверджанні кваліфікацыі, вывучэнні мовы краіны знаходжання, афармленні патрэбных дакументаў, псіхалагічнай адаптацыі ды інш. Магчымасці такіх структур унутры Беларусі даволі абмежаваныя, тым не менш, для пэўных прафесійных груп яны працягваюць застацца вельмі істотнымі, асабліва калі знаходзяцца гнуткія спосабы падтрымкі (напрыклад, стажыроўкі або стыпендыі ў замежных інстытуцыях — для навукоўцаў, журналістаў, культурных дзеячаў; магчымасць прадоўжыць навучанне ў еўрапейскіх універсітэтах — для адлічаных студэнтаў, і да т.п.).

Акрамя таго, у перыяд грамадска-палітычнай мабілізацыі 2020 года сфарміравалася вялікая колькасць суполак і сетак, частка з якіх захоўвае наладжаныя сувязі ды адносіны і сёння выступае ў тым ліку ў якасці груп узаемадапамогі. Гэта і прафесійныя групы, і суседскія супольнасці, і сеткі, якія ўтварыліся па вельмі розных крытэрыях, звязаных з пратэстнай актыўнасцю (ад сумеснага досведу ўдзелу ў акцыях да ўзаемадзеяння сваякоў палітвязняў). Удзельнікі такіх суполак і сетак, якія трапляюць пад забарону на прафесію (як і пад іншыя віды рэпрэсій), часта знаходзяць падтрымку менавіта там, як мінімум, маральную і матэрыяльную, а часам і дапамогу ў пошуку новай працы, перанавучанні, працаўладкаванні.

**Даступнасць знешняй мабільнасці/эміграцыі.** Адносная адкрытасць межаў, дапамога з боку беларускай дыяспары і еўрапейскіх краін (асабліва краін, якія мяжуюць з Беларуссю) ствараюць параўнальна спрыяльныя ўмовы для эміграцыі беларусаў, якія страцілі працу і/ці зазнаюць іншыя пераследы па палітычных падставах. Вымушаная эміграцыя заўсёды траўматычная, аднак шмат хто ўспрымае яе як адзіны ці найбольш рацыянальны выхад са склаўшайся сітуацыі. Часцей за ўсё людзі, якія патрапілі пад звальненні, з'язджаюць у пошуках працы ці проста з-за разумення, што ў цяперашняй Беларусі магчымасці прафесійнай рэалізацыі для іх недаступныя. Ад'езд з краіны з'яўляецца сацыяльна ўхвальным учынкам з боку рэферэнтнай групы (іншых удзельнікаў пратэстнага руху 2020 года), у большасці выпадкаў улады таксама не перашкаджаюць тым, хто вырашыў пакінуць краіну (добраахвотная эміграцыя цалкам укладваецца ў рэалізацыю ўстаноўкі рэжыму на пазбаўленне ад «нелаяльных»).

Адносная даступнасць такога выхаду з сітуацыі, як часовы ад'езд з краіны ці эміграцыя, змякчае наступствы практыкі забароны на прафесію на індывідуальным узроўні, аднак вядзе да сур'ёзных негатыўных наступстваў для беларускага грамадства агулам, у тым ліку мяняючы баланс носьбітаў дэмакратычных і аўтарытарных установак унутры краіны.

# 6. Сістэмныя эфекты рэалізацыі забароны на прафесію для беларускага грамадства

Агулам можна пазначыць шэраг ключавых наступстваў, якія прыносіць разгортванне новага этапу забароны на прафесію ў Беларусі ў тым выглядзе і ў тых маштабах, якія мы зараз можам назіраць:

1. **Кадравы голад і зніжэнне агульнага ўзроўню прафесійнай кваліфікацыі.** Практыка забароны на прафесію рэалізуецца без усялякага ўліку стану вытворчых працэсаў, працы арганізацый і цэлых галін, ідэалагічныя інтарэсы «чыстак» ставяцца вышэй за эканамічныя, вышэй за інтарэсы эфектыўнага функцыянавання найважнейшых сфер жыццезабеспячэння грамадства. Фактычна ўжо назіраецца істотны кадравы голад у адукацыі, медыцыне, культуры, медыях ды іншых абласцях. Акрамя праблемы недахопу кадраў, узнікае пытанне кваліфікацыі тых, хто застаецца. Часта грамадзянскую актыўнасць, наяўнасць уласнай пазіцыі праяўляюць людзі ініцыятыўныя, якія валодаюць высокай прафесійнай кваліфікацыяй, якія маюць пэўныя амбіцыі. У выніку, звальненням падвергліся найбольш кваліфікаваныя спецыялісты, якія часта займалі вядучыя пазіцыі і выконвалі ўнікальныя работы, былі лідарамі прафесіі і творчасці. Як следства (разам з масавай эміграцыяй), многія інстытуцыі, прадпрыемствы і нават галіны пазбавіліся свайго асноўнага кадравага рэсурсу, а таксама магчымасці гадаваць новыя кадры.
2. **Змяненні ў сацыяльнай структуры грамадства.** Калі ў папярэдні перыяд праз забарону на прафесію адбывалася выцяснне «нелаяльных» у менш абароненыя сектары (нефармальныя ініцыятывы, НДА, прыватны бізнес), дзе ў выніку фарміравалася своеасаблівая сацыяльная прастора для свабоды творчасці, ініцыятывы, нестандартнасці, то ў цяперашніх умовах усе дзеянні ў комплексе накіраваны на тое, каб выключыць магчымасць любой актыўнасці, якая не знаходзіцца пад непасрэдным кантролем уладаў. Такі эфект ствараецца за кошт масавых звальненняў у комплексе са знішчэннем грамадскага сектара і пагаршэннем умоў для прыватнага бізнесу. Гэта змяняе саму структуру грамадства, у якім не застаецца лакун для іншадумцаў, «астраўкоў свабоды» і прасторы для развіцця, сацыяльная структура паступова становіцца ўсё больш падобнай на структуру таталітарных грамадстваў.

3. **Негатыўныя гуманітарныя наступствы і эфекты.** Па-першае, чалавек, які страціў працу, аказваецца пад прыгнётам нявызначанасці і ў адносінах да будучыні, і ў адносінах да ўласнай ідэнтычнасці, свайго жыцця, самарэалізацыі. Гэта аказвае разбуральнае ўздзеянне на душэўны стан нават тады, калі ёсць падтрымка і дапамога з боку сям'і, сяброў і калег. Па-другое, несправядлівыя звальненні калег з'яўляюцца сур'ёзным выпрабаваннем для працоўных калектываў. Людзі сутыкаюцца з пакутлівымі дылемамі: пад рызыкай уласнага звальнення выступіць у абарону звольненых калегаў або прамаўчаць і захаваць працу; праявіць салідарнасць і здзейсніць грамадзянскі ўчынак або захаваць магчымасць працягваць сваю справу ў складаных умовах. На глебе ўсяго гэтага расце ўзровень недаверу і ўзаемных прэтэнзій. Гэта адбіваецца не толькі на ўзроўні прафесіяналізму, але і на самапавазе людзей, псіхалагічным самаадчуванні.

4. **Знішчэнне прафесійных супольнасцей.** Практыка рэалізацыі забароны на прафесію ў адносінах да актыўных, незалежных і дзейных людзей рэзка паніжае якасць прафесійных супольнасцей і, у перспектыве, вядзе да іх фактычнага знікнення або выраджэння. Прафесійнае асяроддзе заўсёды служыла адным з найважнейшых фактараў развіцця. Камунікацыя паміж калегамі, наяўнасць узораў для пераймання, разнастайнасць вопыту ствараюць умовы і для прафесійнага росту, і для чалавечага развіцця. У сітуацыі, калі прафесійныя якасці падмяняюцца праявай лаяльнасці, гэтае асяроддзе руйнуецца. Такім чынам ствараюцца ўмовы для сацыяльнай дэградацыі, знішчаюцца тыя мінімальныя гарызантальныя структуры грамадзянскай супольнасці, якія з'яўляюцца апорнай канструкцыяй для любых грамадскіх пераўтварэнняў: супольнасці, групы, прафсаюзы і г.д.

5. **Змяненне этычных установак.** Улічваючы маштабы і сістэмнасць рэалізацыі практыкі забароны на прафесію, можна казаць аб тым, што ў канчатковым выніку яна скіравана на фарміраванне «новых» каштоўнасных і этычных установак, пабудаваных на лаяльнасці, адсутнасці салідарнасці і дэмаралізацыі. «Застаўшыхся» і «звольненых» падзяляюць не толькі розныя акалічнасці жыцця, але і пытанні маралі (самаацэнка, пачуццё здрады і г.д.). Гэта, з аднаго боку, стварае дадатковыя бар'еры ў адносінах паміж людзьмі, а з іншага — вядзе да афармлення пэўнай этычнай сістэмы. Час працуе на яе ўмацаванне і трансляцыю для будучых пакаленняў.

# Асноўныя высновы і напрамкі дзеянняў

Падводзячы вынікі даследавання, можна адзначыць, што рэалізуемая рэпрэсіўная практыка забароны на прафесію мае для сучаснай Беларусі беспрэцэдэнтны характар. Сістэмнасць і мэтанакіраванасць гэтай практыкі пацвярджаецца не толькі разнастайнасцю форм і метадаў, не толькі маштабнасцю і ахопам розных прафесійных груп, але і арганізацыйным і заканадаўчым замацаваннем механізмаў кантролю і пазбаўлення ад «нелаяльных» работнікаў. Ва ўмовах працяглых рэпрэсій і пры адсутнасці публічнасці ў Беларусі практыка забароны на прафесію становіцца ўсё больш прыхаванай, аднак гэта не змяншае яе эфектаў.

Нягледзячы на тое, што на фоне іншых відаў рэпрэсій, якія працягваюцца ў краіне, звальненне з працы ці ліквідацыя арганізацыі здаюцца параўнальна «мяккімі» формамі пераследу, сістэматычная практыка забароны на прафесію вядзе да сур'ёзных негатыўных наступстваў як на індывідуальным узроўні, так і на ўзроўні грамадства ў цэлым. Агульны комплекс дзеянняў у рэчышчы рэалізацыі забароны на прафесію сёння накіраваны на тое, каб чалавек не проста страціў працу, а на поўную маргіналізацыю вялікай колькасці апазіцыйна настроеных у адносінах да дзейнага ў краіне рэжыму людзей. У грамадскім вымярэнні негатыўныя эфекты маюць як эканамічны характар (зніжэнне прафесійнага ўзроўню і кадравы голад у пэўных сферах, зніжэнне эфектыўнасці работы арганізацый і прадпрыемстваў), так і сацыяльны (нагнятанне атмасферы страху, разбурэнне прафесійных супольнасцей, змяненне этычных установак).

Можна канстатаваць, што сёння практыка рэалізацыі забароны на прафесію пераключылася з ранейшай устаноўкі на выбарачную барацьбу супраць палітычных апанентаў кіруючага рэжыму на ўстаноўку татальнай барацьбы з усімі «нелаяльнымі» і ва ўсіх сферах. У практыцы забароны на прафесію ў наш час можна знайсці запазычанне досведу з мінулых перыядаў, свядома ці па інерцыі дзеячы рэжыму капіююць шматлікія ўстаноўкі і механізмы кантролю, якія рэалізоўваліся ў савецкім грамадстве. На дадзены момант стан беларускага грамадства і знешнія ўмовы не дазваляюць забяспечыць той узровень татальнага кантролю, які быў дасягнуты ў СССР, аднак пры адсутнасці пазітыўных змен агульнай сітуацыі колькасць ступеняў свабоды для іншадумцаў і грамадзян, якія проста не праяўляюць актыўнай лаяльнасці, будзе змяншацца.

Такім чынам, на цяперашнім этапе забарону на прафесію трэба разглядаць як мэтанакіраваную палітыку па змене грамадскай свядомасці і сацыяльнай структуры беларускага грамадства. Гэта палітыка будуецца не на перакананні, прасоўванні тых ці іншых уяўленняў, фармаванні даверу да ўлады і яе ідэалогіі, асноўным яе інструментам

становіцца «выцісканне» за межы грамадства і краіны нелаяльных дзейнаму рэжыму грамадзян. Для іх і іх сем'яў ствараюцца ўмовы, у якіх яны ставяцца на мяжу выжывання, пазбаўляюцца сродкаў да існавання, свайго сацыяльнага статусу і капіталу. Гэта палітыка капіюе савецкую практыку, пабудаваную на такім уяўленні аб сацыяльнай структуры грамадства, у якой адсутнічалі будзь-якія нішы для няўпісанага ў сістэму спосабу дзеяння і мыслення.

Выбудоўванне сістэмы зніжэння негатыўных сацыяльных наступстваў ад забароны на прафесію павінна стаць падставай для стратэгіі дзеянняў. Яны маюць ажыццяўляцца ў некалькіх напрамках:

1. **Ідэнтычнасць, пазіцыя і прыналежнасць да «баку дабра».** Асвядомленасць пра масавы характар забароны на прафесію, інфармацыя аб гэтай з'яве як аб мэтанакіраванай рэпрэсіўнай практыцы можа заставацца крыніцай для маральнай і псіхалагічнай падтрымкі людзей, якія ёй падвяргаюцца. Прыналежнасць калі не да большасці, то да вялікай супольнасці вартых людзей з'яўляецца тым пазітыўным кампанентам дадзенай сітуацыі, які павінен усведамляцца. Захаванне высокай самаацэнкі, усведамленне праваты ўласнай грамадзянскай пазіцыі з'яўляецца важным элементам супраціву. Падтрыманне ў грамадскай свядомасці гэтай тэмы, асвядомленасць пра маштабы і асобныя выпадкі можа выступаць не толькі элементам абароны правоў чалавека і аналізу актуальнай сітуацыі, але і часткай дапамогі і падтрымкі тых, хто падвергся забароне на прафесію. Адпаведна, гэта тэма патрабуе шырокага медыйнага асвятлення, накіраванага на захаванне самапавагі для тых, хто пацярпеў ад забароны на прафесію.
2. **Сацыяльны капітал і гарызантальныя сувязі.** Важнае значэнне для пазітыўнага выхаду з сітуацыі пасля звальнення мае аб'ём сацыяльных сувязей і ўзаемадзеянняў (аб'ём сацыяльнага і сімвалічнага капіталу). Гэта дазваляе знайсці як часовую падтрымку, так і новыя шляхі і магчымасці. Каб чалавек не аказваўся сам-насам са сваімі праблемамі, неабходна мабілізацыя сацыяльнага капіталу, сеткавых узаемадзеянняў і дапамогі супольнасцей, у якіх людзі маглі б знаходзіць апору і падтрымку. Тут важна выкарыстоўваць патэнцыял наяўных гарызантальных сувязяў і супольнасцей: лакальных, прафесійных, а таксама пабудаваных на каштоўнасцях і інтарэсах (рэлігійных ды інш.).
3. **Інфармацыя, мадэлі і ўзоры.** Апынуўшыся ў сітуацыі змены прафесійнай сферы ці фармату дзейнасці, ва ўмовах крайняга дэфіцыту рэсурсаў (часовых, маральных, фінансавых), чалавек павінен мець магчымасць хутка знайсці якасную інфармацыю аб разнастайных магчымасцях і кроках дзеянняў. Крытычна важнымі тут з'яўляюцца некалькі параметраў:

- даступнасць інфармацыі (пра гэта павінны казаць многія медыйныя каналы);
- разнастайнасць мадэлей, узораў і прапаноў для розных абставін і магчымасцей: ад больш рэсурсазатратных да самых простых і часовых, ад патрабуючых кваліфікацыі і перакваліфікацыі да даступных любому чалавеку;
- яснасць першых крокаў і працэдур (юрыдычны, арганізацыйны, фінансавы бок).

4. **Навучанне, кансультаванне і «свой» рынак працы.** Паколькі дзейны ў краіне палітычны рэжым з дапамогай забароны на прафесію перакройвае беларускае грамадства, то неабходна ствараць устойлівыя структуры, якія фарміруюць альтэрнатыўную сацыяльнасць. Размова ідзе аб шырокіх праграмах адукацыі, падвышэння кваліфікацыі, атрымання дадатковых прафесійных навыкаў. Гэта не можа быць сродкамі першай дапамогі, аднак такая сістэма павінна стварацца, каб паступова ўключаць у сябе беларусаў, арыентаваных на новую Беларусь. У тым ліку, у яе павінны ўваходзіць установы, арганізацыі і прадпрыемствы, якія маюць магчымасць працаўладкоўваць і садзейнічаць развіццю і падвышэнню матэрыяльнага і сацыяльнага статусу для пацярпелых ад забароны на прафесію. Задача палягае ў стварэнні і падвышэнні патэнцыялу беларускага грамадства, замест растварэння яго ў грамадствах іншых краін.

**«Забарона на прафесію» ў Беларусі:
вяртанне да савецкіх практык
і ўнікальныя рысы**

Справаздача па выніках даследавання

© **Цэнтр еўрапейскай трансфармацыі**, 2023

© **Лятучы ўніверсітэт**, 2023